6. Некоторые характерные черты жителей селения Геран-Бой-Ахмедлы, Елисаветпольской губернии Елисаветпольского уезда // СМОМПК. – Тифлис: Типография Канцелярии Главноначальствующего гражданскою частью на Кавказе, 1887. – № 6. – С. 177–185.
7. Папилова, Е. В. Имагология как гуманитарная наука / Е. В. Папилова // Вестник Московского государственного гуманитарного университета им. М.А. Шолохова. Филологические науки. – 2011. – № 4. – С. 31–40.
8. Предисловие // СМОМПК. – Тифлис : Типография Главного Управления Наместника Кавказского, 1881. – №1 – С. I–XXIV.
9. Село Гадрут Елисаветпольской губернии Джебраильского уезда // СМОМПК. – Тифлис : Типография Главного Управления Наместника Кавказского, 1888. – № 6. – С. 153–192.
10. Село Касапет Елисаветпольской губернии Джеванширского уезда // СМОМПК.– Тифлис : Типография Главного Управления Наместника Кавказского, 1892. – № 13. – С. 42–58.
11. Спящий родник Хусаг-дон // СМОМПК. – Тифлис : Типография Главного Управления Наместника Кавказского, 1882. – № 2. – С. 161–164.
12. Станица Терская Сунженского отдела Терской области // СМОМПК. – Тифлис : Типография Главного Управления Наместника Кавказского, 1893. – № 16. – С. 101–133.
13. Тамазлух, как обычай взаимного вспомоществования домашним скотом // СМОМПК. – Тифлис: Типография Главного Управления Наместника Кавказского, 1889. – № 7. – С. 69–70.
14. Хотинец, В. Ю. О содержании понятий этническая самоидентификация и этническое самосознание / В. Ю. Хотинец // Социологические исследования. – 1999. – № 9. – С. 67–74.

**Карпекін К.Р.**

## ПАМЯТНЫЯ КНІЖКІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ІЎДЗЕЙСКІХ АБШЧЫН У СЯРЭДЗІНЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Значнае месца ў жыцці поліканфесійнага насельніцтва, якое пражывала ў беларускіх губернях Расійскай імперыі ў сярэдзіне XIX – пачатку XX ст., займалі іўдзеі. Калі ў 1847 г. на згаданай тэрыторыі налічвалася амаль 226 тыс. прадстаўнікоў іўдзейскага веравызнання, то да 1897 г. іх колькасць узрасла да 724,5 тыс. чалавек. У такіх буйных гарадах, як Бабруйск, Віцебск, Гомель, Магілёў, Мінск, яны складалі 50–60 % насельніцтва, а ў цэлым па беларускіх губернях – 13,6 % [1, с. 326]. Натуральна, прадстаўнікі іўдзейскай канфесіі аказвалі значны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае жыццё насельніцтва беларускіх губерняў.

Важнай крыніцай па гісторыі цэнтральнай і ўсходняй Беларусі з'яўляюцца памятныя кніжкі Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў, якія рыхтаваліся губернскімі статыстычнымі камітэтамі. Выданні выходзілі адпаведна ў 1845–1916 гг., 1853–1916 гг. і 1845–1916 гг. [2]. Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца аналіз звестак, датычных іўдаізму, якія ўтрымліваюцца ў памятных кніжках беларускіх губерняў.

Усю інфармацыю з указаных вышэй выданняў магчыма аб'яднаць у пэўныя тэматычныя групы:

- статыстычныя звесткі пра колькасць асоб паводле веравызнання, у тым ліку і іўдзеяў. Інфармацыя пададзена ў выглядзе табліц, асобныя графы якіх прысвечаны кожнаму з паветаў пэўнай губерні і кожнаму павятоваму цэнтру. Акрамя таго што пададзены агульны лік прадстаўнікоў таго ці іншага веравызнання, асобна падлічана колькасць мужчын і жанчын. Такія табліцы змешчаны амаль ва ўсіх памятных кніжках Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў;
- статыстычныя звесткі пра колькасць прадстаўнікоў розных саслоўяў (у тым ліку пра іўдзейскае духавенства). У табліцах звесткі прыведзены для губернскіх і павятовых цэнтраў, а таксама для кожнага з паветаў. У памятных кніжках Віцебскай губерні такія звесткі друкаваліся ў 1860–1890-я гг., Магілёўскай – у 1860–1910-я гг., Мінскай – у канцы 1850-х , а таксама з сярэдзіны 1860-х да канца 1890-х гг., а ў выданнях першай паловы 1880-х гг. прыводзіліся звесткі толькі ў цэлым па Мінскай губерні;
- статыстычныя звесткі пра колькасць нованароджаных (асобна па кожнай з канфесій). Інфармацыя была пададзена па павятовых цэнтрах і па паветах, прычым асобна прыводзіліся звесткі пра хлопчыкаў і дзяўчынак. Па Віцебскай губерні такія звесткі змяшчаліся ў кнігах за 1860-я гг., а за астатнія гады – эпізадычна. У памятных кніжках Магілёўскай губерні падобная інфармацыя – вельмі рэдкая, затое ў іх табліцы былі самымі падрабязнымі (акрамя ўказаных вышэй паказчыкаў паведамлялася колькасць законна- і незаконнанароджаных дзяцей). Што тычыцца Мінскай губерні, то ў 1850–1880-я гг. статыстыка пра нованароджаных змяшчалася дастаткова рэдка, найбольш поўна яна прадстаўлена ў 1890-я гг.;
- статыстычныя дадзеныя пра памерлых іўдзеяў і прадстаўнікоў іншых канфесій. У адпаведных табліцах маецца інфармацыя па ўсіх павятовых цэнтрах і паветах кожнай з губерняў, пра пол памерлых, зрэдку ўказаны іх узрост. У памятных кніжках Віцебскай і Магілёўскай губерняў



Рэпазіторый ВДУ

падобная інфармацыя – нешматлікая (як правіла, трапляецца ў 1850–1860-я гг.). Асаблівасцю віцебскіх выданняў з'яўляецца тое, што ў некаторых з іх прыведзена статыстыка па месяцах (у прыватнасці – на 1887 г.). У памятных кніжках Мінскай губерні за 1850–1890-я гг. звесткі пра памерлых змяшчаліся рэгулярна;

- звесткі пра натуральны прырост насельніцтва па ўсёй губерні ў цэлым ці па кожнаму з павятовых цэнтраў і павету. Падобная інфармацыя характэрна толькі для выданняў па Мінскай губерні (звесткі на 1897 і 1898 гг.);
- інфармацыя пра колькасць заключаных шлюбаў (па кожнай канфесіі – асобна). Як правіла, была прыведзена статыстыка па ўсіх паветах і павятовых цэнтрах. У памятных кніжках Віцебскай губерні звесткі такога кшталту найбольш часта друкаваліся ў 1860-я гг., часам указваўся таксама ўзрост асоб, якія ўступілі ў шлюб. Па Магілёўскай губерні такая інфармацыя таксама вельмі рэдкая, чаго нельга сказаць пра Мінскую губерню. Статыстычныя звесткі пра колькасць заключаных паміж іўдзеямі шлюбаў змяшчаліся з інтэрваламі ў некалькі гадоў на працягу канца 1850–1890-х гг., прычым у некаторых выданнях інфармацыя прыводзілася ў цэлым па губерні;
- колькасць іўдзеяў, якія перайшлі ў праваслаўе. Такія спецыфічныя звесткі характэрны толькі для памятных кніжак Віцебскай губерні на 1864, 1865 гг.;
- статыстычныя звесткі пра колькасць сінагог і іўдзейскіх малітоўных дамоў па паветах і павятовых цэнтрах (у пераважнай большасці выпадкаў колькасць каменных і драўляных будынкаў падавалася асобна). У кнігах па Віцебскай губерні ўтрымліваюцца звесткі на 1861, 1862 , 1864, 1878 гг., па Магілёўскай – на 1859, 1862, 1889, 1905 гг., па Мінскай – на 1858, 1860, 1863, 1888 г.;
- календары іўдзейскіх святаў і пастоў (з указаннем дат паводле грыгарыянскага і яўрэйскага календароў). У памятных кніжках Віцебскай губерні такія матэрыялы ўпершыню з'явіліся ў 1881 г. і штогод друкаваліся да 1905 г. Рэлігійныя календары таксама былі змешчаны ў выданнях па Магілёўскай губерні за 1860-я і 1900-я гг. і амаль штогод на працягу канца 1870–1910-х гг. – у памятных кніжках Мінскай губерні;
- звесткі пра казённых і духоўных рабінаў: поўнае імя, месца службы, дата заняцця пасады. У некаторых выданнях сярод звестак пра казённых рабінаў былі ўказаны таксама назвы навучальных устаноў, якія яны скончылі, узрост і памер заробку. Для памятных кніжак Віцебскай губерні характэрна сціслая інфармацыя пра служыцеляў іўдзейскага культа: імёны і адукацыя – пра казённых рабінаў, толькі імёны – пра духоўных. Упершыню згаданыя звесткі былі змешчаны ў выданні 1900 г. і друкаваліся штогод да 1916 г. У памятных кніжках Магілёўскай і Мінскай губерняў інфармацыя пра рабінаў змяшчалася дастаткова часта на працягу ўсяго перыяду выхаду выданняў у свет;
- табліцы з інфармацыяй пра колькасць розных тыпаў яўрэйскіх рэлігійных навучальных устаноў па губерні ў цэлым, асобных паветах і павятовых цэнтрах, лік настаўнікаў і навучэнцаў у іх. Падрабязныя звесткі па Віцебскай губерні змяшчаліся толькі ў кнігах за 1860-я гг., надалей жа прыводзіліся абагуленыя звесткі ў цэлым па губерні, гарадах і паветах. Звесткі пра іўдзейскія навучальныя ўстановы Магілёўскай губерні маюцца ў выданнях 1890–1910-х гг. Для памятных кніжак Мінскай губерні, як і для Віцебскай, уласціва абагуленая інфармацыя (як правіла, па губерні ў цэлым), яна змешчана ў кнігах за 1870–1900-я гг.;
- звесткі пра канкрэтныя навучальныя ўстановы (з ліку іўдзейскіх згадваюцца толькі талмудторы – абшчынныя пачатковыя рэлігійныя школы). У памятных кніжках указаны імёны старшыняў, сябраў апякунскіх саветаў і рэвізійных камісій, выкладчыкаў, іх узрост і час прызначэння на пасаду. Па Віцебскай губерні звесткі друкаваліся, пачынаючы з сярэдзіны 1880-х гг. і да пачатку 1910-х гг., а ў памятнай кніжцы на 1895 г. таксама была змешчана інфармацыя пра час адкрыцця талмуд-тор. Па Магілёўскай губерні маюцца звесткі толькі за 1910-я гг., па Мінскай – за 1880–1910-я гг.;
- абагуленыя звесткі пра дабрачынныя ўстановы, якія дзейнічалі пры іўдзейскіх абшчынах. Указаны месцазнаходжанне, колькасць апякуемых, кошт утрымання і крыніцы паступлення даходаў. Падобныя звесткі ў памятных кніжках – нешматлікія: па Магілёўскай губерні маецца інфармацыя за 1898, 1900 гг., па Мінскай – за 1893–1896 гг.;
- звесткі пра канкрэтныя іўдзейскія дабрачынныя грамадствы (пахавальныя, пазыковыя і інш.). У спецыяльных артыкулах былі ўказаны імёны, а часам і адукацыя, адрас пражывання



Рэпазіторый ВДУ

старшыняў, казначэяў і сябраў дабрачынных аб'яднанняў. Інфармацыя пра іх утрымліваецца ў асобных памятных кніжках Віцебскай і Магілёўскай губерняў за 1910-я гг.

Акрамя пералічаных вышэй рубрык у некаторых памятных кніжках была змешчана спецыфічная інфармацыя, нехарактэрная для іншых аналагічных выданняў. Напрыклад, толькі ў кнігах па Магілёўскай губерні за канец XIX – пачатак XX стст. былі апублікаваны ведамасці пра размеркаванне яўрэйскага насельніцтва па розных тыпах населеных пунктаў (па гарадах, мястэчках, калоніях і сёлах). Звесткі былі пададзены па кожнаму з паветаў, асбона была падлічана колькасць мужчын і жанчын.

Вялікую цікавасць для даследчыкаў уяўляюць змешчаныя ў памятных кніжках гістарычныя звесткі пра гарады і мястэчкі беларускіх губерняў. Апроч іншага ў іх указаны лік яўрэяў у кожным населеным пункце, а таксама колькасць сінагог і малітоўных дамоў (з абазначэннем матэрыялу, з якога яны былі пабудаваны). Такая інфармацыя змешчана ў памятнай кніжцы Магілёўскай губерні на 1861 г. і Мінскай губерні на 1878 г.

У сваю чаргу складальнікамі памятных кніжак Віцебскай губерні на 1863, 1881, 1885, 1898 гг. былі падрыхтаваны нарысы пра прадстаўнікоў яўрэйскай народнасці, якія пражывалі ў рэгіёне (змяшчалі інфармацыю пра з'яўленне яўрэяў на тэрыторыі губерні, іх этнаграфічную характарыстыку, агляд прафесійных заняткаў). У памятнай кніжцы Віцебскай губерні на 1865 г. утрымліваецца кароткае апісанне іўдзейскіх культавых будынкаў г. Віцебска, указаны іх адрасы і месца размяшчэння на карце. У дадзеным выданні таксама маецца агульная характарыстыка іўдзейскіх дабрачынных грамадстваў горада, рэлігійных атрыбутаў яўрэяў (скруткаў Торы, тфілінаў і інш.).

У памятных кніжках розных беларускіх губерняў існавалі розныя падыходы да размяшчэння інфармацыі, датычнай іўдзейскіх абшчын. У прыватнасці, у табліцах са статыстычнымі звесткамі пра колькасць прадстаўнікоў розных веравызнанняў, саслоўяў, нованароджаных, шлюбаў і да т.п., як правіла, выконвалася паслядоўнасць, згодна з якой спачатку прыводзіліся звесткі пра праваслаўных, затым – пра стараабраднікаў, каталікаў, пратэстантаў, іўдзеяў і мусульман. Такая заканамернасць прасочваецца на працягу ўсяго перыяду выдання кніг па Віцебскай губерні. У памятных кніжках Магілёўскай губерні з 1910 г. інфармацыю пра іўдзеяў пачалі друкаваць пасля каталікаў, а пра пратэстантаў і мусульман – пасля іўдзеяў. У сваю чаргу з 1903 г. па Мінскай губерні дадзеныя пра іўдзейскае насельніцтва сталі падавацца ў самым канцы табліц. Логіку падобных змен у структуры кніг зразумець складана: у прыватнасці, паслядоўнасць размяшчэння звестак нельга растлумачыць удзельнай вагой прадстаўнікоў пэўнага веравызнання ў агульнай колькасці насельніцтва губерні.

Календары рэлігійных святаў, якія публікаваліся ў пачатку памятных кніжак, як правіла, змяшчаліся ў наступнай паслядоўнасці: праваслаўны – каталіцкі – лютэранскі – іўдзейскі – мусульманскі (прычым лютэранскія і мусульманскія календары друкаваліся не заўсёды). Праўда, у памятных кніжках Віцебскай губерні з пачатку XX ст. звесткі пра іўдзейскія святы прыводзіліся пасля мусульманскіх.

Параўноўваючы звесткі пра служыцеляў розных культаў, рэлігійныя навучальныя ўстановы і дабрачынныя грамадствы, можна прыйсці да высновы, што ўсе яны ў роўнай ступені інфарматыўныя, незалежна ад таго, пра якую канфесію ідзе гаворка.

Такім чынам, у памятных кніжках беларускіх губерняў утрымліваецца вялікая колькасць інфармацыі па гісторыі іўдзейскіх абшчын Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў сярэдзіны XIX – пачатку XX стст. На падставе звестак статыстычнага і біяграфічнага характару магчыма вывучаць такія аспекты яўрэйскай гісторыі, як дынаміка колькасці іўдзейскага насельніцтва і культавых будынкаў, развіццё яўрэйскай рэлігійнай адукацыі, дзейнасць іўдзейскіх дабрачынных аб'яднанняў і г.д. Усе памятныя кніжкі ў цэлым маюць падобную структуру, што значна аблягчае пошук патрэбнай інфармацыі.

1. Краткая еврейская энциклопедия : в 11 т. / ред. совет: Ш. Эттингер [и др.]. – Иерусалим : Кетер, 1976. – Т. 1. – 756 с.
2. Памятные книжки белорусских губерний [Электронный ресурс]. – Электронные текстовые, графические данные и программа (10,5 Гб). – Минск, 2012. – 3 электронных оптических диска (DVD-ROM).